АРК

# Весці БДПУ

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.
Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

**№ 4(50) 2006**

СЕРЫЯ 2.
Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія.
Эканоміка. Культуралогія

## Змест

***Галоўны рэдактар:***
П. Дз. Кухарчык

***Рэдакцыйная калегія:***
Н. Г. Алоўнікава
А. І. Андарала
(*нам. галоўнага рэдактара*)
У. В. Амелькін
В. А. Бондар
М. К. Буза
В. В. Бушчык
(*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў
(*нам. галоўнага рэдактара*)
І. В. Бялько
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Г. А. Космач
У. М. Котаў
Н. І. Кунгурава
М. В. Лазаковіч
І. Я. Левяш
М. І. Лістапад
А. М. Люты
У. А. Мельнік

Весці БДПУ
№4(50) сер.2.

***Гісторыя***

*Бушчык Г. П.* Унутрысаюзныя сувязі БССР па ўвозе і вывазе прамысловай прадукцыі ў 70—80-я гг. XX ст. ........ 3

*Барабаш Н. В.* Віды і формы міграцыйных працэсаў у БССР у першыя пасляваенныя гады (1945—1950-я гг.) ........ 9

*Якаўчук В. І.* Аднаўленне і развіццё пажарнага добраахвотніцтва Беларусі ў пасляваенныя гады (1944—1957 гг.) ........ 12

*Юрчак Дз. В.* Беларуска-ўкраінскае двухбаковае супрацоўніцтва ў галіне культуры, навукі і адукацыі ў 1991—2004 гг. ........ 15

*Пуцік У. С.* Падзенне ролі Рускай Праваслаўнай Царквы ў сацыяльнай сферы і рост яе палітычнай актыўнасці ў Беларусі ў пачатку XX ст. ........ 19

*Дрывень І. І.* Дзейнасць франтавых камітэтаў УЗС і УСГ па аказанні дапамогі арміі і насельніцтву ........ 23

*Шкуцько Л. Л., Драздова К. А.* Станаўленне капіталістычных банкаў на тэрыторыі беларускіх губерняў у другой палове XIX — пачатку XX ст. ........ 27

*Пракаповіч Л. Э.* Гістарыяграфія і крыніцы па гісторыі фабрычна-заводскай прамысловасці Беларусі ў другой палове XIX ст. ........ 31

*Сянькевіч А. І.* Барацьба са злачыннасцю падлеткаў у канцы XIX—пачатку XX стст. і яе сувязь са станаўленнем заканадаўства аб ахове правоў дзіцяці ........ 35

*Доўнар Л. А.* Крэдытная палітыка савецкай дзяржавы адносна прыватнай вытворчасці ў Беларусі перыяду НЭПа ........ 38

*Крывіцкі Д. С.* Дыскрэдытацыя партызанскага руху ў Беларусі германскімі спецслужбамі: лжэпартызанскія атрады ........ 43

*Вінніца Г. Р.* Выратаванне яўрэяў Праведнікамі на акупіраванай тэрыторыі Усходняй Беларусі ........ 46

*Старычонак В. В.* Эвалюцыя амерыканскай грамадскай думкі па пытанні аб пачатку вайны супраць Ірака (жнівень 1990 — студзень 1991 г.) ........ 49

*Варывончык І. В.* «Неакансерватыўная рэвалюцыя» Рональда Рэйгана ........ 54

*Цзян-Шу-і.* Праблема Тайваня ў савецка-кітайскіх адносінах (другая палова 40-х — 50-я гг. XX ст.) ........ 58

***...асофія***

*...сюк У. Ф.* Феномен чалавека: адзінства цэласнасці ...чнасці ........ 63

*...яцюк В. В.* Беларускі менталітэт як аснова грамадзянскай ...вядомасці ........ 67

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 947.6:271.2

*У. С. Пуцік*

# ПАДЗЕННЕ РОЛІ РУСКАЙ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ Ў САЦЫЯЛЬНАЙ СФЕРЫ І РОСТ ЯЕ ПАЛІТЫЧНАЙ АКТЫЎНАСЦІ Ў БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКУ XX СТ.

Руская Праваслаўная Царква заўсёды была арганізацыяй сацыяльна ўкаранёнай, з дастаткова зямнымі клопатамі, іерархізаванай (з уласнай пірамідай улады, «вярхамі» і «нізамі», асаблівымі карпаратыўнымі інтарэсамі), актыўна ўдзельнічала ў грамадскіх справах, з рознымі, аднак, на тым ці іншым гістарычным этапе поспехам для сябе і карысцю для грамадства [1].

Палітычны крызіс у імперыі ў пачатку XX ст. ахапіў і Праваслаўную Царкву. Асноўнай прычынай стала неадпаведнасць арганізацыйных і ідэйных прынцыпаў царквы сацыяльна-эканамічным і сацыякультурным тэндэнцыям і павевам, звязаным з развіццём капіталістычных адносін у расійскім грамадстве. Ніжэйшыя класы спешна ўцягваліся ў эканамічную і палітычную барацьбу за свае правы, расслойвалася сялянства, разбураўся патрыярхальны ўклад жыцця. Духавенства не разумела і не жадала прымаць аб'ектыўны характар гэтых глабальных працэсаў, зводзячы ў сваёй большасці ўсю праблематыку да псавання маралі. У выніку сацыяльная ўкаранёнасць Праваслаўнай Царквы аслаблялася. Яна практычна засталася безудзельнай у адносінах да вострых рабочага і сялянскага пытанняў.

Аслабленне інтарэсу прыхаджан да царкоўна-прыходскага жыцця, фармалізацыя ўзаемаадносін духавенства і паствы на фоне рэвалюцыйных падзей і антыклерыкальных лозунгаў — усё гэта выклікала сур'ёзную заклапочанасць у іерархаў царквы. Неабходна было прадпрымаць кардынальныя захады, пакуль народ не прамяняў тыя маральныя прынцыпы, якія засталіся, на рэвалюцыйныя.

Вывучэнне нарастання крызісу ў царкве і яго ўплыву на грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі напярэдадні і ў гады рэвалюцыі 1905—1907 гг. уяўляе значную навуковую і практычную цікавасць у сучасных умовах адраджэння царкоўнага жыцця.

Між тым у гістарычнай навуцы роля Рускай Праваслаўнай Царквы з пачатку XX ст. і па сённяшні дзень недастаткова распрацаваная. Савецкая гістарычная навука ва ўмовах ваяўнічага атэізму і дзяржаўнага заказу на адлюстраванне царквы як інстытута, заўсёды ворага народу, не здолела аб'ектыўна падысці да яе вывучэння. Значнае месца ў гістарыяграфіі гэтага перыяду займае даследаванне аўтарскага калектыву пад кіраўніцтвам прафесара А. І. Клібанава «Русское православие: вехи истории» [ 2 ], дзе аўтары здолелі абысці ідэалагічныя ўстаноўкі і ўсебакова раскрыць гісторыю царквы. У сучаснай беларускай навуцы трэба вызначыць даследчыкаў В. В. Грыгор'еву, М. М. Забаўскага, М. В. Біча, якім удалося ў сваіх працах на высокім навуковым узроўні разгледзець пытанні, што датычацца дзейнасці Рускай Праваслаўнай Царквы, асабліва падчас рэвалюцыі 1905—1907 гг.

У пачатку XX ст. Руская Праваслаўная Царква ўяўляла сабой шматлікую і разгалінаваную рэлігійную арганізацыю, цесна звязаную з дзяржаўным апаратам. На чале Царквы стаяў Свяцейшы Правячы Сінод, створаны ў выніку царкоўнай рэформы Пятра І.

Асноўным звяном мясцовага царкоўнага кіравання былі епархіі. Па сваёй тэрыторыі яны часцей за ўсё супадалі з губернямі. У 1905 г. у Расійскай імперыі налічвалася 66 епархій, у Паўночна-Заходнім краі іх было пяць: Віленска-Літоўская, Гродзенска-Брэсцкая, Мінска-Тураўская, Магілёўска-Мсціслаўская і Полацка-Віцебская.

Царква з'яўлялася не толькі культавым цэнтрам прыхода, але і інфармацыйным: святар паведамляў прыхаджанам пра распараджэнні ўрада і Сінода, асноўныя падзеі ў грамадскім і рэлігійным жыцці епархіі і краіны ў цэлым. Безумоўна, танальнасць інфармавання, за рэдкім выключэннем, была прасякнута духам пакорлівасці і ціхмянасці перад самадзяржаўнай уладай манарха.

Кожная епархія Рускай Праваслаўнай Царквы мела сваё перыядычнае выданне — епархіяльныя ведамасці. У беларускіх епархіях выдаваліся «Литовские епархиальные ведомости» (з 1863 г.), «Минские епархиальные ведомости» (з 1869 г.), «Полоцкие епархиальные ведомости» (з 1874 г.), «Могилевские епархиальные ведомости» (з 1883 г.), «Гродненские епархиальные ведомости» (з 1901 г.) [3, с. 104].

У пачатку XX ст. праваслаўнае духавенства ўжо не ўяўляла сабой замкнутую сацыяльную касту. Царкоўныя рэформы 60—70 гг. XIX ст.

былі накіраваны на пераўтварэнне духоўнага саслоўя ў свабодную прафесійную групу, якая магла б больш эфектыўна выконваць пастырскую і грамадскую ролю. Была катэгарычна забаронена спадчынная перадача царкоўных пасад і адменены ўсе сямейныя прэтэнзіі на службовыя месцы ў царкве. Спадчыннасць духоўнага статусу ліквідавалася, а дзеці духавенства маглі беспераашкодна выбіраць сабе жыццёвы шлях. Духоўныя школы адкрываліся для дзяцей усіх слаёў насельніцтва.

Удзел духавенства ў грамадска-палітычным жыцці быў абмежаваны законам. Земскае Палажэнне 1890 г. і Гарадское Палажэнне 1892 г. забаранялі праваслаўнаму духавенству быць выбраным у земскія павятовыя і губернскія сходы і ў гарадскія думы, прымаць удзел у выбарах у гэтыя ўстановы [4, с. 23].

Пра наяўнасць і нарастанне крызісу Праваслаўнай Царквы сведчыла падзенне аўтарытэту духавенства і рэлігійнасці насельніцтва імперыі, асабліва сярод працоўных. І гэта прызнавалі самі клірыкі. «Минские епархиальные ведомости» паведамлялі ў 1906 г.: «Духавенства паціху амаль паўсюль згубіла сваю маральную прывабнасць для народа. Нядзіўна, што калі ў многіх месцах падняліся аграрныя беспарадкі, духавенства не магло аказаць на сваю паству ніякага ўплыву» [5].

У гарадах таксама можна было назіраць карціну адчужанасці паствы ад духавенства. Вось што пісаў пра гэта архіепіскап Літоўскі і Віленскі Нікандр: «Сувязь паміж імі назіраецца часта толькі фармальная. Пастыры з'яўляюцца толькі здзяйсняльнікамі богаслужэнняў і адпраўнікамі патрэб, але не духоўнымі кіраўнікамі сваіх пасомых, тымі, хто ведае іх рэлігійна-маральны стан і ідзе насустрач задавальненню іх духоўных запытаў. Пасомыя са свайго боку абыякава ставяцца да спраў Царквы, і калі звяртаюцца да духавенства, то пераважна па пабуджэннях чыста знешніх — за атрыманнем метрычнай выпіскі, перадшлюбных звестак або для здзяйснення той ці іншай патрэбы, неабходнай у сувязі з патрабаваннямі грамадзянскіх законаў» [6, с. 333].

Аднак стан і дзейнасць Праваслаўнай Царквы ў Паўночна-Заходнім краі і ва ўнутраных рэгіёнах імперыі вельмі адрозніваліся. Руская Праваслаўная Царква як састаўная частка дзяржаўнага апарату на нацыянальных ускраінах імперыі з'яўлялася інструментам русіфікацыі і праўрадавай прапаганды.

Свой адбітак на светапогляд мясцовага духавенства наклала і пагранічнае становішча Беларусі на стыку каталіцкага і праваслаўнага свету. У «Всеподданнейшем отчете...» ад 20 мая 1904 г. Віленскага генерал-губернатара П. Д. Святаполк-Мірскага для Мікалая II адзначалася, што «разсвобожденная Православная Церковь вышла из-под католического ига не полною христианской любви, а церковью боевой и поэтому нетерпимой... Равнодушие у одних и непримиримый фанатизм у других суть черты, встречаемые нередко среди здешнего духовенства, — черты, столь чуждые в других местностях и нашему народу, и нашему духовенству» [7, с. 103]. Далей генерал-губернатар адзначыў, што галоўны недахоп мясцовага праваслаўнага духавенства — у «адхіленні ад прамых сваіх абавязкаў на карысць палітычнай дзейнасці». І больш таго, аўтар незадаволены ўмяшальніцтвам праваслаўнага духавенства ў грамадскае і палітычнае жыццё краю, што нярэдка выклікае ўскладненні, шкодныя для справы ўрада [7, с. 103].

Такім чынам, аслабленне сваіх сацыяльных функцый Праваслаўная Царква ў Беларусі імкнецца галоўніць павышэннем актыўнасці ў грамадскім і палітычным жыцці. Гэта было прадыктавана ўнутраным становішчам у Паўночна-Заходнім краі ў другой палове XIX ст. Пасля паўстання 1863—1864 гг. палітыка царызму на беларускіх землях прыняла жорсткую накіраванасць на зацвярджэнне тут рускіх дзяржаўных асноў. Ажыццяўлялася яна пад сцягам «заходнярускага адраджэння». Такая ўрадавая палітыка поўнасцю адпавядала інтарэсам Праваслаўнай Царквы ў краі.

Менавіта Праваслаўная Царква, яе святары ўзялі на сябе цяжар працы, каб пераканаць беларусаў у тым, што іх родная зямля спрадвеку рускі край, а самі яны апалячаныя рускія, якіх зараз трэба вярнуць і да Праваслаўнай Царквы, і да рускай народнасці [8, с. 71].

Праваслаўнае духавенства ў беларускіх губернях было сапраўдным саюзнікам самадзяржаўнай улады па барацьбе з «польскім уплывам». Удзел у гэтай барацьбе прадугледжваў яго актыўную палітычную дзейнасць, што выклікала насцярожанасць у ліберальна настроенай часткі апаратчыкаў. Так, П. Д. Святаполк-Мірскі ў палітызацыі царквы ўбачыў пагрозу ўрадаваму курсу.

У цэлым і ў грамадстве, і ў дзяржаўных структурах, і ў іерархіі ўсведамлялі неабходнасць змен у царкоўнай сферы з мэтай паступовага яе раздзяржаўлення і ўзмацнення незалежнасці.

Прынцыпова тэма рэфармавання царкоўнай арганізацыі была паднята на рэлігій-

РЭПАЗІТОРЫЙ ВДПУ

на-філасофскіх сходах у Пецярбурзе, у якіх ўдзельнічалі як прадстаўнікі інтэлігенцыі, што цікавіліся рэлігіяй і багаслоўем, так і клірыкі. Гісторык царквы Д. В. Паспялоўскі адзначыў, што менавіта «гэтыя сходы перакінулі мост цераз прорву, што падзяляла свецкае грамадства і царкву» [4, с. 25].

Пад ціскам апазіцыйнай грамадскай думкі 12 снежня 1904 г. урад паабяцаў у бліжэйшы час заканадаўча аформіць у краіне верацярпімасць, а крыху пазней было прынята рашэнне аб падрыхтоўцы да правядзення Памеснага Сабору Рускай Праваслаўнай Царквы.

Хутка Свяцейшы Сінод прапанаваў разгледзець на Памесным Саборы, што меў адбыцца, наступныя пытанні: аб раздзяленні Расіі на царкоўныя акругі пад кіраўніцтвам мітрапалітаў, аб пераўтварэнні царкоўнага кіравання, аб прыходзе, аб парадку набыцця царкоўнай уласнасці, аб удзеле свяшчэннаслужыцеляў у грамадскіх арганізацыях і інш.

Першыя водзывы архіерэяў сталі паступаць у духоўнае ведамства ў канцы кастрычніка 1905 г. К вясне 1906 г. былі атрыманы апошнія водзывы і з'явілася магчымасць іх сістэматызацыі.

Архіерэі беларускіх епархій, за выключэннем гродзенскага епіскапа Міканора, спрабавалі даць разгорнутыя і поўныя адказы на пастаўленыя Сінодам пытанні [6, с. 807].

Архіерэі беларускіх епархій, не лічачы гродзенскага, аднадушна выказаліся за раздзяленне Расіі на мітрапаліцкія акругі. Яны прызнаваліся сродкам устаранення з царкоўнага жыцця «няправільнасцей» і больш поўнага задавальнення мясцовых царкоўных патрэб, паколькі цэнтралізацыя вышэйшага царкоўнага кіравання, якая існавала, перашкаджала ажыццяўленню яго распараджэнняў. Неабходнасць устаранення гэтай перашкоды была асабліва яснай для праасвяшчэнных паўночна-заходніх епархій. Епіскапы Серафім і Нікандр прама звязвалі пытанне аб раздзяленні Расіі на царкоўныя мітрапаліцкія акругі з праблемай устаранення міжнацыянальных і міжканфесіянальных супярэчнасцей у краі. Вось што пісаў з гэтай нагоды праасвяшчэнны Серафім Полацкі: «Аб'яднанне праваслаўных беларусаў неабходна і не церпіць адкладу. У цяперашні час згуртаваліся жыды, згуртаваліся палякі, але гэта — сілы цэнтрабежныя. Вось у супрацьвагу гэтым сілам цэнтрабежным неабходна ўзяцца за наладжванне сіл цэнтраімклівых, сіл беларускіх, сіл магутных, але неналаджаных: цэнтрам, які аб'яднае гэтыя сілы, і будзе заходнеруская мітраполія з кафедрай у Вільні» [9, с. 196].

Для архіепіскапа Літоўскага Нікандра практычнае вырашэнне пытання аб стварэнні мітрапаліцкіх акруг у Паўночна-Заходнім краі з цэнтрам у Вільна заключалася ў «заступніцтве і абароне з боку царкоўнай улады» беларускай паствы «ад падкопаў фанатызаванага каталіцтва, якое імкнецца на ўсю сілу паглынуць цяпер гэтую частку рускага карэннага насельніцтва, далучыўшы яго да рымскай царквы», калі Праваслаўная Царква ўжо «не можа спадзявацца на знешнюю абарону з боку грамадзянскай улады», як гэта было да 17 красавіка 1905 г. [6, с. 329—330]. Аднаўленне старажытнай Літоўскай мітраполіі, на думку Нікандра, «створыць больш спрыяльныя, чым цяпер, умовы для барацьбы з рыма-каталіцтвам пад агульным сістэматычным кіраўніцтвам абласнога прадстаўніка Царквы» [6, с. 330]. Грамадска-палітычная накіраванасць і палемічная танальнасць былі ўласцівыя многім водзывам на пытанні Святога Сінода ад архіерэяў епархій, якія знаходзіліся на нацыянальных ускраінах імперыі.

Выключная ўвага надавалася ў водзывах праблеме рэфармавання праваслаўнага прыхода. Праасвяшчэнныя прапаноўвалі аднавіць прыход як царкоўную абшчыну, згуртаваную вакол свайго прыходскага храма і пастыра, натхнёную агульнасцю духоўных інтарэсаў. Яны лічылі неабходнай умовай рэарганізацыю прыходскага жыцця, пашырэнне сферы дзейнасці прыхаджан і іх актыўны ўдзел у царкоўных справах. Практычна прапаноўвалася шырэй выкарыстоўваць у гэтай справе вопыт каталіцкай і пратэстанцкай канфесій.

Усе архіерэі беларускіх епархій, як і пераважная большасць епіскапата царквы, былі супраць увядзення выбарчага пачатку, калі цывільныя маглі б выбіраць царкоўна- і свяшчэннаслужыцеляў. Серафім Полацкі пісаў, што падобная практыка «будзе садзейнічаць развіццю ў прыходах інтрыг і партыйнасці» [9, с. 211].

Амаль усе епіскапы прызнавалі наяўнасць эканамічнай падаплёкі неўпарадкаванасці прыходскага жыцця. Таму яны прапаноўвалі надаць прыходскай абшчыне статус юрыдычнай асобы, каб яна магла свабодна набываць рухомую і нерухомую маёмасць. Архіерэі прапаноўвалі таксама прысвоіць епархіяльнаму духавенству права юрыдычнай асобы на набыццё нерухомай маёмасці і валоданне ёю [10, с. 209].

На пытанне пра ўдзел духавенства ў гарадскіх, земскіх і іншых грамадскіх установах усе архіерэі адказалі станоўча. Яны спасы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

лаліся на тое, што святару больш чым каму вядомы патрэбы народа і толькі ён можа быць адзіным заступнікам «сапраўднага хрысціянскага добраўпарадкавання» [9, с. 220]. Адносна саставу будучага Сабору праасвяшчэнныя беларускіх епархій таксама выказваліся адзінагалосна за ўдзел у ім, акрамя архіерэяў і іх наменнікаў, прэсвітэраў і міран з правам дарадчага голасу.

Параўнанне водзываў архіерэяў беларускіх епархій і астатніх праасвяшчэнных Расійскай царквы паказвае, што першыя займалі больш умераныя пазіцыі. Яны не былі прыхільнікамі радыкальных рэформ, згодна з «духам часу», як «лібералы» на чале з мітрапалітам Антоніем (Вадкоўскім), але і не адчувалі страху перад глыбокімі зменамі ў царкоўным жыцці, калі тыя былі выкліканы яе надзённымі патрэбнасцямі, чым адрозніваліся «кансерватары» на чале з епіскапам Валынскім Антоніем (Храпавіцкім).

14 студзеня 1906 г. Свяцейшы Сінод прыняў рашэнне аб стварэнні Перадсаборнай Прысутнасці для папярэдняга абмеркавання ўсіх намечаных да саборнага разгляду пытанняў. У яе ўвайшлі вядомыя архіерэі, святары і цывільныя багасловы. Іх задачай была падрыхтоўка матэрыялаў для Памеснага Сабору [11, с. 707].

Праз падрыхтаваныя імі матэрыялы чырвонай ніткай праходзіла патрабаванне змяніць царкоўна-дзяржаўныя адносіны; дабіцца такога становішча спраў, пры якім унутрыцаркоўныя праблемы не служылі б інструментам палітычнай выгады дзяржавы, бо многія палітыкі бачылі прыход у якасці дробнай земскай адзінкі і звязвалі з яго ажыўленнем надзеі на вырашэнне старых пытанняў — «дваранскага» і «сялянскага».

Аднак на практыцы свабоднага, самакіравальнага прыходу ў імператарскай Расіі не існавала. Адпаведна, «задача заключалася не ў тым, каб узнавіць, а ў тым, каб стварыць такі прыход. Ва ўмовах тых царкоўна-дзяржаўных адносін гэта было наўрад ці магчымым» [10, с. 234].

Умацаванне царкоўнай самастойнасці ва ўрадавыя планы стабілізацыі краіны не ўваходзіла. Старшыня Савета Міністраў П. А. Сталыпін меў уласны план «рэфармавання» царквы — падпарадкаваць яе міністэрству веравызнання, у якім Сінод стане галоўным упраўленнем «праваслаўнай рэлігіі». Царкоўная іерархія выступіла супраць праекта прэм'ер-міністра, не дапусціўшы абмеркавання яго ў Дзяржаўнай Думе [12, с. 234].

Па жаданні імператара нарады Перадсаборнай Прысутнасці былі аб'яўлены закрытымі Свяцейшым Сінодам 15 снежня 1905 г. Усе матэрыялы Прысутнасці паступілі ў Сінадальны архіў. Рэзалюцыя цара ад 25 красавіка 1907 г. «Собор пока не созывать» паклала канец падрыхтоўцы рэформы [4, с. 30].

Рух за рэфармаванне царквы, у якім актыўны ўдзел прымалі архіерэі беларускіх епархій, быў спынены свецкай уладай. Рэкамендацыі епіскапаў, заснаваныя на практычным веданні канкрэтных праблем епархіяльнага і прыходскага жыцця і накіраваныя на іх вырашэнне, так і не былі разгледжаны да канца, не кажучы ўжо пра іх рэалізацыю. Тым не менш, водзывы праасвяшчэнных, як у люстэрку, выявілі сімптомы не толькі царкоўнага, але і грамадскага крызісу, што разбурыў Расійскую імперыю ў пачатку XX ст.

Свецкая ўлада не хацела і не лічыла неабходным звяртаць увагу на ўнутрыцаркоўныя праблемы. Царква не магла іх вырашыць адна, пакуль рэвалюцыйныя ўзрушэнні не прымусілі ўрад, няхай з-за прагматычных меркаванняў, даць духоўнай іерархіі свабоду і магчымасць паспрабаваць знайсці выйсце з крызіснага стану. Аднак пасля спаду рэвалюцыйнай актыўнасці мас наступіў перыяд рэакцыі, што азначала спыненне ўсіх працэсаў, так ці інакш звязаных з рэфармаваннем структур дзяржаўнай сістэмы, у тым ліку і царкоўнай арганізацыі. Духавенства як паслухмянае манарху саслоўе не магло перайсці ў адкрытую апазіцыю да свецкай улады, тым больш што духоўную і свецкую ўладу аб'ядноўвала агульная стратэгічная задача — барацьба з рэвалюцыяй і сіламі, якія імкнуліся аслабіць самадзяржаўе і разам з ім царкву. Агульным вынікам крызісу Праваслаўнай Царквы пачатку XX ст. у Беларусі з'явілася далейшая пераарыентацыя яе дзейнасці з сацыяльных пытанняў на палітычныя, што вяло да ўзмацнення залежнасці ад царскіх улад, іх непазбежнай агульнай пагібелі.

*Літаратура і крыніцы*


1. *Миронов, Г. Е.* История государства Российского: Историко—библиографические очерки. XIX век / Г. Е. Миронов / РГБ. — М.: Изд-во «Ин. палата», 1995. — 734.
2. Русское православие: Вехи истории / науч. ред. А. И. Клибанов. — М.: Политиздат, 1989. — 719 с.
3. Рэлігія і царква на Беларусі : энцыкл. давед. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]; — Мінск : БелЭн, 2001. — 386 с.
4. *Поспеловский, Д. В.* Русская православная церковь в XX веке / Д. В. Поспеловский М. Республика 1995 — 509 с.
5. Минские епархиальные ведомости за 1906 год.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

6. Отзывы епархиальных архиереев по вопросу о церковной реформе. В 3 т. М., 2004. Т. 2. — 1055 с.
7. «Всеподданнейший отчет...» виленского, гродненского и ковенского генерал-губернатора П. Д. Святополк-Мирского Николаю II от 20 мая 1904 г. (падрыхтавалі да друку Міхась Біч і Віктар Пінчукоў) // Беларускі гістарычны часопіс. — 1997. — № 2. — С. 94—116.
8. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII—XX ст.). — Мінск : ВП «Экаперспектыва», 1998. — 340 с.
9. Отзывы епархиальных архиереев по вопросу о церковной реформе. В 2 т. М., 2004 Т. 1.— 1031 с.
10. *Фирсов, С. Л.* Русская церковь накануне перемен (конец 1890-х — 1918) / С. Л. Фирсов. М., 2002. — 624 с.
11. История русской церкви: В 9 кн. М.: Изд-во Спасо-Преображ. Валаам. монастыря. 1997. Кн. 8. Ч. 2. 1700—1917. — 798 с.
12. Очерки истории Санкт-Петербургской епархии. — СПб., 1994. — 284 с.

SUMMARY

*The article touches upon the problems, connected with the history of the Orthodox Church on the territory of Belarus. Its role and position are determined in political and social processes at the beginning of the XX-th century. The activity and the attitude of the Church towards autocratic state, political and social movements in the country are analyzed.*

*УДК 940.315*

***І. І. Дрывень***

# ДЗЕЙНАСЦЬ ФРАНТАВЫХ КАМІТЭТАЎ УЗС І УСГ ПА АКАЗАННІ ДАПАМОГІ АРМІІ І НАСЕЛЬНІЦТВУ

**Уводзіны.** 30 ліпеня (8 жніўня) 1914 г. пасля аб'яўлення Германіяй вайны з Расіяй у Маскве адбыўся з'езд упаўнаважаных губернскіх земстваў, на якім (па прапанове Маскоўскага губернскага земства) быў створаны Усерасійскі земскі саюз (УЗС) дапамогі хворым і параненым воінам. У Саюз увайшлі ўсе губернскія земствы, акрамя Курскага. Агульнае кіраўніцтва дзейнасцю Саюза было ўскладзена на сход упаўнаважаных губернскіх земстваў, які выбіраў Галоўнаупаўнаважанага і Галоўны камітэт з 10 членаў. На месцах былі арганізаваны губернскія і абласныя камітэты.

12 жніўня 1914 г. дзейнасць УЗС была афіцыйна дазволена ўладамі. Акрамя гэтага, Таварыства Чырвонага Крыжа аб'явіла аб сваёй апецы над дзейнасцю Саюза. 8—9 жніўня 1914 г. паралельна з УЗС утварыўся Усерасійскі саюз гарадоў (УСГ). Спачатку паміж УЗС і УСГ адбываліся некаторыя непаразуменні, але ў хуткім часе быў наладжан кантакт, тым больш, што змест іх дзейнасці і метады работы былі падобнымі.

У 1915 г. пачалося адступленне рускай арміі з Галіцыі, Карпат і Польшчы. Недахоп зброі і боепрыпасаў паставілі перад Саюзамі новую задачу — садзейнічаць баявому забеспячэнню арміі. 30 мая 1915 г. камітэт УСГ прыняў пастанову: «1) выказаць прывітанне Савету гандлёва-прамысловага з'езда наконт прынятых гэтым з'ездам рэзалюцый; 2) прызнаць неабходным у поўным яднанні з Земскім саюзам, гандлёва-прамысловым камітэтам і навукова-тэхнічнымі сіламі, прыняць неадкладны ўдзел у справе забеспячэння арміі і дэлегаваць сваіх прадстаўнікоў ў ваенна-прамысловыя камітэты» [1, с. 25].

**Аб'ект і змест даследавання.** Першапачаткова меркавалася, што дзейнасць УЗС і УВСГ будзе абмежавана толькі арганізацыяй лячэбных устаноў і санітарных цягнікоў ва ўнутраных раёнах імперыі, на франтах жа будуць працаваць толькі ўстановы ваеннага ведамства і Чырвонага Крыжа. УСГ і УЗС прыступілі да разгортвання лазарэтаў ва ўнутраных раёнах імперыі, выкарыстоўваючы для гэтага ў якасці ядра свае грамадскія лячэбныя ўстановы і ўрачэбна-санітарныя рэсурсы [2, с. 287]. Але цяжкае становішча дастаўкі раненых з фронту, вялікія памеры і разнастайныя формы медыка-санітарнай дапамогі і дапамогі ў забеспячэнні харчаваннем заставілі значна пашырыць дзейнасць Саюзаў і распаўсюдзіць яе непасрэдна на франтах дзеючых армій. На франтах былі створаны палявыя шпіталі, амбулаторыі, лазня-пральныя атрады, бальніцы для заразных хворых, лабараторыі, склады, рамонтныя майстэрні, салдацкія крамы і г. д. Усяго да 1 студзеня 1915 г. адным толькі Земскім саюзам на франтах было створана 2500 устаноў, у якіх працавала 15 тыс. чалавек абслугоўваючага персаналу. На Заходнім фронце Земскім саюзам было створана 235 лячэбных устаноў з 14550 ложкамі. На працягу 1915—1916 гг. праз гэту шпітальную сетку прайшлі 321 тыс. хворых і параненых [3, с. 45].

Для работы на франтах Саюзы атрымлівалі ад урада вялікія сумы грошай. Так, адзін толькі камітэт Заходняга фронту Земскага

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ